Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрес Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

...месяц з дастаўкай да хаты і пераслкай ўцаю паштай. ...ена адраса 40 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата нагрунавааага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 45 — Вільня, Серада 7-га верасьня 1927 г. — Год I

Новае пакушэньне на Радавага прадстауніка у Варшаве.

2-га верасьня, каля 11 гадзіны раніцай, у Радавае Пасольства ў Варшаве зьявіўся віленец, Язэп Трайковіч, які жыў на Пасьпешцы ў доме № 130, і, сустрэўшы ў вычыдальні кур'ера Пасольства Гусева, сказаў, што хоча бачыцца з кіраўнікам Пасольства, Ульянавым. Кур'ер адказаў, што сам пусьціць яго да Ульянава ня можа, а павінен перш папытацца ў апошняга, ці захоча прыняць Трайковіча. Тады Трайковіч кінуўся да Гусева з кінжалам і прабіў яму шчаку, а пасьля кінуў ляжаўшую на стале кнігу ў партрэт Леніна, што вісеў на сьцяне, ды памыкаўся ўцячы. Кур'еры хацелі прытрымаць яго. Тады Трайковіч дастаў другі нож — складаны, ды пачаў даставаць з кішані рэвальвэр. У гэты мамэнт Гусев сам выхапіў рэвальвэр і некалькімі стрэламі забіў Трайковіча на месцы.

Як інфармуе „Кур. Віл.“, Трайковіч, чалавек мала інтэлігентны, быў у вялікай прыязьні з Кавэрдай. У Варшаву ён прыехаў у аўторак. Дагэтуль ад 1921 году ён нікуды з Вільні не выяжджаў.

Агентуры працуюць...

Мы йшчэ не забыліся аб сэнсацыйнай заяве галавы польскага ўраду, марш. Пілсудскага, аб тым, што чужацкія агентуры ня толькі працавалі ў Польшчы ў пэрыяд яе тварэньня, але *працуюць і сягоньня*,— а вось раз за разам два яркія доказы гэтае агентурнае працы.

Здаецца, ні для кога не сакрэт, што забойства радавага пасла ў Варшаве, Войкова, — гэта дзела *рук* расейскіх манархістаў, але *галавы* — аднае такое заграніччнае агентуры, якая за ўсялякую цану хацела-бы выклікаць вайну паміж Польшчай і ССРР, каб гэтак перашкодзіць у працы Радавага Саюзу над адбудовай і разьвіцьцём свайго гаспадарчага жыцьця—з аднаго боку, ды пазбавіць радавы ўрад магчымасьці вясьці актыўную палітыку ў Азіі, дзе гэтая палітыка асабліва крэпка б'ець па інтарэсах Англіі.... Вось-жа пасьля доўгіх перагавораў між польскім і радавым ўрадамі, пасьля колькіразовых прыездаў у Варшаву польскага пасла ў Маскве,—канфлікт, які натуральна ўзьняўся паміж Радамі і Польшчай на груньце варшаўскага забойства, *быў зьліквідаваны*. І хіба-ж ніхто ня будзе сумлявацца, што няўдалае пакушэньне расейскага манархіста Трайковіча на часовага заступніка радавага пасла ў Варшаве, Ульянава, якое здарылася *чуць-што не назаўтра пасьля абвяшчэньня аб ліквідацыі польска-радавага канфлікту*,—не прыпадкова зыйшлося з гэтым абвяшчэньнем: тыя, хто кіраваў воляй і рукой Трайковіча, пэўне зусім сьвядома выбралі *іменна гэты мамэнт* дзеля новае крывавае расправы з прадстаўніком Радавага Саюзу, каб стала ствараць стан канфлікту паміж Польшчай і ССРР.

Вось першы вывад з факту новага варшаўскага пакушэньня на жыцьцё дыпляматычнага прадстаўніка ССРР ў Польшчы. Але для нас, беларусаў, факт гэты мае йшчэ асаблівае значэньне.

Перадусім для нас цікаўна тое, што замаховец Трайковіч—гэта *віленец і таварыш Кавэрды*, забойцы пасла Войкова. Ведаючы тутэйшыя адносіны, мы ні на мамэнт не сумляваемся, што беспасярэднім кіраўніком паступкаў як Кавэрды, так і Трайковіча, зьяўляецца ўсё тая-ж віленская арганізацыя расейскіх манархістаў, якая дзіўна неяк астаецца незакранутай усімі высылкамі „непажаданых“ расейскіх эмігрантаў з межаў Польшчы.... А выбар гэтай арганізацыяй, як чарговае ахвяры, заступніка радавага пасла ў Варшаве, Ульянава, які ў самым хуткім часе мусіў пакінуць сваё часовае становішча (новы радавы пасол ужо намечаны!), набірае для нас асаблівае вагі, калі прымем пад увагу *нацыянальнасьць* Ульянава: ён—*беларус*!

Гэта апошняе проста выклікае думку, што *нацыянальны мамэнт* адыграў тут паважную ролю. Бо-ж кожнаму ведама, з якой дзікой ненавісьцяй расейскія манархісты адносяцца да ўсяго беларускага. Дык узьнімаецца паважная небясьпека для беларускіх дзеячоў пад Польшчай наагул (ведама, апрача дэфэнзыўных): пераканамыя аб сваей бяскарнасьці, маральныя забойцы Войкова і замаху на Ульянава могуць пашукаць і далейшых ахвяр сярод нашых павадыроў у Заходняй Беларусі. Прынамся, ужо даўно ходзяць па Вільні падобныя чуткі і гутаркі. Дык калі-б запраўды сталася нешта падобнае, то мы наперад паказуем тое гняздо, з якога ўсе гэткія злачынствы бяруць *натхненьне*.

Новы школьны год.

Распачаўся новы школьны год.

Ня гледзячы на дзесяткі тысяч пададзеных уладам дэклярацыяў на беларускія ўрадавыя школы, справа беларускага школьніцтва як-быццам і далей стаіць на мёртвым пункце. Бо-ж гутаркі аб тым, быццам у Віленскім ваяводстве маюць быць адчынены колькінадцаць утраквістычных школ (польска-беларускіх), — гэта-ж рэч зусім непаважная. Непаважнай зьяўляецца і тая рэкляма, якая робіцца польскай „толеранцыі“ органам паноў Рагулі і Ярэміча—„Сялянскай Нівай“— з прычыны адзінокага здарэньня дазволу ўладаў на адчыненьне нейкай аднэй нямчаснай прыватнай беларускай школкі ў Браслаўшчыне, адчыненай так-званым „Інстытутам Беларускае Гаспадаркі і Культуры“, кіраваным ў супалцы клерыкаламі, сельсаюзьнікамі і... польскімі „дэмакратамі“.

Вось-жа гэтыя дробныя ўступкі — „адчэпныя“, якія робіць польская ўлада, даючы колькінадцаць польска-беларускіх школак замест некалькіх сотняў беларускіх, на якія пададзены дэкляранцыі,—не павінны ні на адзін мамэнт аслабіць нашу барацьбяную энэргію у змаганьні за родную школу, не павінны збудзіць у нас думкі, быццам ужо ўсё наладжваецца, як сьлед. Нічога не наладжваецца само-сабой: усё мусіць быць здабыта. І калі ўрад робіць дробныя ўступкі, якія агульнага палажэньня ў краі не зьмяняюць, дык гэтым ён толькі сцьвярджае нашае права на родную школу, якую дзяржава абязана ўтрымліваць для беларусаў. І тым больш энэргічна мусім мы сёлета павясьці кампанію за беларускую школу—шляхам, прадугледжаным законамі Польшчы.

Мы мусім зрабіць гэта тым больш, што ўрад, даючы нам некалькі ці колькінадцаць школ замест некалькіх сот, адначасна ўсё больш рашуча праводзе ў жыцьцё закон аб так званым школьным прымусе, змушаючы гэтак беларусаў — пад пагрозамі адміністрацыйных караў — пасылаць дзяцей у існуючыя ўсюды, пазакладаныя тым-жа ўрадам, польскія школы. Бо ніякія гутаркі аб „тымчасовасьці“ такога прымусу адносна да польскіх школ ня могуць нас здаволіць, — бо іменна дзеля таго, каб прымусовая навука нашых дзяцей у польскіх школах была запраўды тымчасовай, мы павінны чым дужэй падыймаць свой голас з дамаганьнем беларускае школы. Інакш — тымчасовасьць абернецца ў нешта сталае і нязьменнае.

У папярэдніх нумарох мы зьмясьцілі адозвы і інструкцыі Галоўнае Управы Таварыства Беларускае Школы. Цяпер заклікаем нашае грамадзянства дружна ўзяцца за правядзеньне акцыі падаваньня новых дэкляраў за беларускую школу, заклікаем да цэлага раду выступленьняў — перадусім у новаабраных самаўрадах — з дамаганьнем урадавае школы ў роднай нам беларускай мове.

Інакш — і перад пачаткам наступнага школьнага году мы астанемся ізноў перад „разьбітым карытам“, як астаёмся сёлета.

Дык усе — да чыннай працы, усе — на школьны фронт!

Эндэцкі орган „Газ. Варш. Пор.“ у перадавіцы з 4-га верасьня востра нападае на школьную палітыку нямецкага ўраду ў адносінах да школьніцтва польскае меншасьці ў Нямеччыне. І—калі паданыя ў газэце факты згодны з праўдай, дык абурэньне яе—зусім справядлівае.

Газэта падае гэткія спосабы „нішчэньня астачы польскага школьніцтва на нямецкіх усходніх крэсах. „Найбольш ужываным спосабам зьяўляецца перанос польскіх вучыцялёў—у нямецкія школы ў глыбіні Нямеччыны, а польскія крэсавыя школы зачыняюцца — „з прычыны адсутнасьці адпаведных пэдагагічных сіл“, або на тэй-жа брахлівай падставе не адчыняюцца новыя; або ўрэшце на становішчы вучыцялёў польскіх школаў назначаюцца асобы, якія калечаць польскую мову і зьнеахвочываюць да польскае навукі“.

Так піша „Газ. Варш. Пор.“ — аб польскіх школах у Нямеччыне. І вось, мімаволі ўспамінаюцца акурат такія-ж факты з жыцьця беларускае школы пад Польшчай. Прыпомнім хаця-бы знамяніты вываз каля 200 беларускіх вучыцялёў з Заходняе Беларусі на кракаўскія курсы ў 1922 годзе і назначэньне на іх месца ў ведзеных імі школах палякоў—ведама-ж, з пераробкай белар. школ на польскія.... Прыпомнім, што гэным кракаўскім курсантам акурат таксама даваліся польскія школы ў глыбіні Польшчы, а дома — у іх родных вёсках—польскія вучыцялі вучылі дзяцей папольску... Прыпомнім урэшце, як на чысьленыя дамаганьні беларускіх школ, навет прыватных, школьныя ўлады адказывалі систэматычна, што школы ня могуць быць адчынены з прычыны... адсутнасьці выкваліфікаваных вучыцельскіх сіл.... І тады аналёгія будзе поўная!

Розьніца толькі ў тым, што тады, як гэта рабілася ў нас, уся польская прэса пахваляла гэту палітыку, — цяпер-жа тыя самыя газэты, якія лічылі палітыку польскага ўраду ў адносінах да беларусаў — справядлівай, ганьбуюць нямецкую ўладу, якая акурат тое самае робіць у адносінах да сваіх палякоў!

Крывадушнікі! Дзе-ж у вас сорам і сумленьне?

Сэсія Лігі Народаў.

У панядзелак адчынілася сэсія Лігі Народаў.

Да гэтага часу зьяжджаліся дэлегацыі і засядала Рада Лігі. На паседжаньнях было, аднак, пуста і глуха. Усё адбывалася фактычна за кулісамі — на прыяцельскіх так-званых вячэрах і спатканьнях. Адбыліся: прыяцельская вячэра францускай і нямецкай дэлегацыі, спатканьне Штрэзэмана з Чэмбэрленам, ды Штрэзэмана з Брыянам. Чэмбэрлен з Брыянам па—прыяцельску спаткаліся раней у Парыжы. Ясна, што аб гэтых прыяцельскіх вячэрах і спатканьнях нічога ня пішацца...

Польскі праект пакту аб неагрэсіі.

Сэнсацыю выклікаў польскі праект пакту (умовы) аб неагрэсіі (ненападаньні), агульнага для ўсіх дзяржаў, якія ўваходзяць у Лігу Народаў. Праект гэты напамінае знамяніты Жэнэўскі пратакол, адкінуты ў свой час Англіяй. З гэтага відаць, што ён зьяўляецца праектам ня толькі Польшчы, але і Францыі і Бэльгіі. Ад Жэнэўскага пратаколу ён адрозьніваецца толькі тым, што не зьмяшчае загадаў і забавязаньняў да міжнародавых карных санкцыяў, на выпадак нарушэньня яго, — гэта знача: не зьмяшчае, як піша польская прэса, тасаваньня караў, не прадбачаных у статуце Лігі Народаў. Праект гэты мае быць унесены на агульны кангрэс Лігі Народаў.

„Робтнік“, верны сваей ролі трубадура заможнай „міралюбівай“ палітыкі буржуазных урадаў Эўропы і Польшчы, гэтак адзываецца аб ім: „Рэч ясная, праект, аб якім гаворым, не вырашае (падкрэсьлена намі, Рэд.) пытаньня сталага міру. Усё ж трэба яго разумець, як далейшую працу Польшчы над умацаваньнем міру, — працу, распачатую ў той час, калі Польшча далучылася да Жэнэўскага пратаколу.

Як адзываецца нямецкая прэса.

Уся нямецкая прэса горача займаецца польскім праектам. Уся прэса выказывае пагляд, што праект мае характар новага Жэнэўскага пратаколу. Праект гэты мае на мэце давясьці Нямеччыну да ўсходняга Лёкарно.

„Лёкаль Анцайгер“ піша, што пасьля размовы з Штрэзэманам нямецкая дэлегацыя пераканана, што праект гэты апіраецца на тых самых ідэях, што і Жэнэўскі пратакол. „Лёкаль Анцайгер“ зьвяртае ўвагу на зьмену адносін Англіі да Нямеччыны і кажа аб небясьпецы, што гэты праект — у выпадку зьдзейсьненьня яго — стварыў-бы плятформу для супольнага адналітага фронту супроць ССРР.

„Крэйц Цайтунг“ думае, што Чэмбэрлен спраціўіцца гэтаму праекту. Далей аднак газэта дадае, што асаблівае надзеі на спраціў Чэмбэрлена ў адносінах да гэтага праекту — на тэй падставе, што ён быў праціўнікам Жэнэўскага трактату, — накладаць ня прыходзіцца. І без агульных парук, як у жэнэўскім пратаколе, новы праект Польшчы ляжаў-бы на лініі англійска-францускай палітыкі ў адносінах да ССРР.

„Тэлеграфэн Уньён“ паведамляе ў гэтай справе, што англійская дэлегацыя ў жадным выпадку ня згодзіцца на ўзнаўленьне Жэнэўскага пратаколу, уважаючы яго бязмэтным.

„Дэр Таг“ лічыць, што праект Польшчы скіраваны на тое, каб забясьпечыць ей шляхам агульнага пакту аб неагрэсіі (ненападаньні) непарушнасьць, як з боку Нямеччыны, гэтак сама і з боку Радавага Саюзу. Польшча імкнецца: 1) да зламаньня нямецкага спраціву ў справе гарантыі яе заходніх граніц; 2) да забясьпечаньня сабе на выпадак канфлікту з Радамі помачы ўсіх эўрапэйскіх дзяржаваў; 3) да ўцягненьня Нямеччыны ў агульную палітыку заходніх дзяржаў, каб гэткім спосабам у выпадку канфлікту можна было вымагаць ад Нямеччыны аднастаронняга становішча, не даючы ей жадных кампэнсат, адплат у запраўдным падзеле здабычы між дзяржавамі. Для Нямеччыны гэты плян азначае сьмяротную пагрозу, і яна павінна падобныя праекты ў прынцыпе адкінуць. Гэтак кажа надзвычай уплывовы і паважны „Дэр Таг“.

Сацыял здрадніцкі „Форвэртс“ ня рададзіць з мейсца ў кар'ер адкідаць гэты праект. Польшча, падтрымліваная Францыяй, — піша „Форвэртс“, — жадае, каб парукі ненападаньня былі б выразьней выказаны, чым у нямецка-польскім арбітражным дагаворы. З свайго сацыялістычнага пункту гледжаньня „Форвэртс“ годзіцца без усялякіх засьцярог з гэткім пактам. „Форвэртс“ і „Роботнік“, як мы бачым, аднолькава ацэніваюць праект.

Балтыцкая Канфэрэнцыя ў Жэнэве(?)

Карэспандэнт „Нойэ Фрае Прэсэ“ паведамляе з Жэнэвы, што міністры Латвіі, Эстоніі і Фінляндыі сабраліся на спэцыяльную канфэрэнцыю, якая мае замяніць балтыцкую канфэрэнцыю ў Рызе. На канфэрэнцыі мае быць абгаворана справа стварэньня балтыцкага блёку і справа адносінаў да ССРР. Радам мае быць запрапанаваны супольны трактат цэнтральнасьці. У дыпляматычных кругах лічаць, што за гэтай канфэрэнцыяй укрываецца Англія. Новы балтыцкі блёк зажадае прадстаўніцтва ў радзе Лігі і высуне кандыдатуру Фінляндыі, якую падтрымае таксама Англія.

Лічачы гэтую вестку ня зусім праўдападобнай, мы прыводзім яе, як характэрыстыку тэй атмасфэры, у якой адбываецца сэсія Лігі Народаў. Усё паказывае на тое, што цэнтральнай праблемай на гэтай сэсіі зьяўляецца пытаньне аб ССРР.

Да нашых падпішчыкаў.

Пасылаючы рахункі, просім пав. грам. Падпішчыкаў урэгуляваць падпісную плату.

Хто да 1 кастрычніка не ўрэгулюе падпісной платы, або ня прышле паведамленьня, што грошы будуць прысланы, таму высылка газэты будзе спынена. **Адміністрацыя.**

Зьмярканьне Англіі.

I.

Яшчэ до сусьветнае вайны Англія выяўляла адзнакі ўпадку. Сусьветны гандаль яе, хоць і рос, але ў росьце сваім адставаў ад росту сусьветнага гандлю іншых імпэрыялістычных дзяржаў, а перадусім—Нямеччыны. Англію даганялі...

У гэтым для Англіі ўкрывалася пагроза ўтраты ў будучыні сваіх ранейшых уплываў, свайго значэньня, сваей магутнасьці; укрывалася пагроза зьмяншэньня будучых зыскаў для паноў ангельскіх капіталістаў — на карысьць перадусім нямецкіх. І пагроза гэта была зусім рэальная.

Ужо да вайны ангельскі таргова баланс даваў дэфіцыт. Даходы, аднак, ад гандлёвага флёту ня толькі пакрывалі яго, але й давалі яшчэ некаторую надвышку. Працэнты ж ад ранейшых пазычак і даходы ад замежных прадпрыемстваў ангельскіх капіталістаў, лікам каля 3 міліярдаў руб. золатам, стваралі магчымасьць далейшых капітальных укладаў у ангельскіх каленіях і па-за іх мэтамі, стваралі далейшыя рынкі.

Аднак, ангельская буржуазія не хацела пагадзіцца з паступовай утратай свайго пяршынства, якому пагражалі перадусім яе нямецкія калегі. Вынікам гэтага нежаданьня страціць пяршынства, і ды—можна сказаць—манаполію на эксплятацыю ўсяго сьвету, — зьявілася сусьветная вайна, з'арганізаваная Англіяй, каб здушыць нямецкую канкурэнцыю, здушыць нямецкі імпэралізм.

Мы ведаем, колькі міліёнаў людзей страціла свае жыцьцё, колькі міліёнаў страціла сваё здароўе, колькі было праліта крыві і зьнішчана народнага дабра, каб зьнішчыць нябясьпечную для ангельскіх капіталістаў канкурэнцыю нямецкіх калег, каб захаваць пяршынства ў эксплёатацыі ўсяго сьвету ангельскімі капіталістамі.

Вынікі сусьветнай бойні нам таксама ведамы. Нямеччына разьбіта і, як канкурэнт на сусьветным рынку, на некаторы час падарвана: яшчэ дагэтуль вываз нямецкіх тавараў на траціну меншы чым перад вайной, ня кажучы ўжо аб тым, што з краю, які вывозіў капітал, Нямеччына зрабілася краем прывозячым.

Аднак, Нямеччына памалу апраўляецца. Ход разьвіцьця яе паказвае, што гэткі стан доўга ня ўтрымаеш. Азброеным кулаком ня спыніш дзейнасьць эканамічных законаў, а толькі стрымаеш на некаторы час нармальны ход рэчаў. І вось, ня гледзячы на тое, што Англіі ўдалося на некаторы час зламаць і спыніць да пэўнай ступені нямецкую канкурэнцыю на сусьветным рынку, ей не ўдалося дасягнуць сваей галоўнай мэты: захаваць сваё пяршынства, сваю перавагу на сусьветным рынку. Навет наадварот: у выніку сусьветнай вайны яна якраз утраціла сваё пяршынства і перавагу. Утраціла на карысьць перадусім Амэрыкі, а так сама часткова й Японіі.

У той час як эўрапэйскія капіталісты напружалі ўсе сілы, каб зламаць адзін аднаго, калі ўся нямецкая, француская і ангельская прамысловасьць працавалі на вайну — на здушэньне й разьбіцьцё свайго канкурэнта, — на сусьветным рынку ўзьняўся страшэнны попыт на прамысловыя тавары. Сусьветны пастаўшчык: Эўропа — ня мела магчымасьці здаволіць яго, занятая вырабам не тавараў, а зброі і неабходных для вядзеньня вайны прадуктаў. Мала таго: яна сама была прымушэна прывозіць іх да сябе з-за акіяну. Вынікам гэтага было надзвычайнае па свайму тэмпу разьвіцьцё прамысловасьці пазаэўрапэйскіх краёў і каленіяў, а перадусім — Амэрыкі і Японіі. Амэрыка з Японіяй ня толькі запоўнілі больш-менш тую прорву, якая сталася ва сусьветным рынку з прычыны адыхода ад яго Эўропы, але, як напрыклад Амэрыка, зрабіліся пастаўшчыкамі Эўропы.

Калі скончылася вайна, дык Англія апынулася твар у твар з новымі, яшчэ гразьнейшымі канкурэнтамі на сусьветным рынку. Англія хутка перавяла сваю прамысловасьць на мірную вытворчасьць, аднак папярэдняга свайго становішча яна ня толькі ня здолела сабе вярнуць, але ў далейшым сыстэматычна яго губляе—перадусім на карысьць Амэрыкі і Японіі. Куды мы ні зьвернемся, усюды яскрава заўважым гэтае зьявішча.

Вось характарныя цыфры для важнейшых англійскіх каленіяў:

Прывоз у Індыю:

	1913	1922	1923	1924	1925
з Англіі	64,2%	60,3%	57,7%	54,4%	52,3%
з Амэрыкі	2,6%	6,1%	5,4%	5,8%	6,1%
з Японіі	2,6%	5,5%	6,2%	6,9%	7,9%

Прывоз у Аўстралію.

	1913	1922	1923	1924	1925
з Англіі	51,8%	51,4%	51,9%	45,2%	43,9%
з Амэркі	13,7%	18,3%	18,9%	24,6%	24,6%
з Японіі	1,2%	3,5%	3,0%	2,5%	2,6%

Прывоз у Новую Зэляндыю:

	1913	1922	1923	1924	1925
з Англіі	59,7%	55,5%	55,3%	51,1%	52,0%
з Амэрыкі	9,5%	14,1%	15,4%	15,6%	16,4%

Прывоз у Паўдн. Афрыку:

	1913	1922	1923	1924	1925
з Англіі	56,8%	56,4%	53,8%	51,5%	50,0%
з Амэрыкі	8,9%	11,3%	12,4%	13,9%	14,7%

Хоць у гэтых калёніях Англія і дагэтуль захавала сваё пяршынства, але, як відаць з гэтых табліц, учасьце яе сыстэматычна падае з году ў год. У астатняй вялікай калёніі Канадзе ўжо да вайны Амэрыка абагнала Англію і заняла пануючае мейсца. За апошнія часы гэта перавага ўсьцяж расьце. Вось колькі цыфр прывозу ў Канаду:

	1913	1925
Англія	21,3%	17,7%
Амэрыка	64,0%	65,8%

Як у Канадзе, так і ў іншых амэрыканскіх краёх і калёніях, Амэрыка мела перавагу над Англіяй, але за апошнія часы яна яшчэ павялічылася і павялічваецца:

Прывоз на Кубу:

	1913	1925
Англія	11,5%	4,0%
Амэрыка	53,7%	62,9%

Прывоз у Мэксыку:

	1913	1925
Англія	13,5%	7,8%
Амэрыка	50,6%	70,2%

Гэткае ж зьявішча мы заўважым і ў краёх Азіі і паўднёвай Амэрыкі, дзе ні Англія ні Амэрыка не апаноўвалі большасьці рынку.

Прывоз у Кітай:

	1913	1922	1923	1924	1925
Англія .	16,5%	14,6%	12,7%	12,1%	9,7%
Амэрыка	6,0%	17,3%	16,3%	18,4%	14,8%
Японія .	20,3%	23,7%	22,2%	22,6%	31,0%

Прывоз у Японію:

	1913	1922	1923	1924	1925
Англія .	16,8%	12,3%	12,0%	12,8%	8,8%
Амэрыка	16,8%	31,5%	25,8%	27,7%	25,9%

Тут да вайны ўчасьце ў прывозе—роўнае. Цяпер учасьце Амэрыкі ўтрая большае за англійскае.

Для поўнай характэрыстыкі ўпадку ангельскага сусьветнага гандлю—гэтай асновы англійскай магутнасьці — і для ўзросту яе галоўнага канкурэнта — Амэрыкі, — падамо яшчэ пару цыфр з Паўднёвай Амэрыкі:

Прывоз у Аргэнтыну:

	1913	1922	1923	1924	1925
Англія .	31,1%	23,4%	23,8%	23,4%	22,6%
Амэрыка	14,7%	22,1%	20,9%	22,0%	23,4%

Прывоз у Бразылію:

	1913	1922	1923	1924
Англія	24,5%	25,8%	26,6%	23,9%
Амэрыка	15,7%	22,8%	22,2%	24,2%

Гэтак, куды мы ні глянем, на ўсенькім сьвеце ўбачым упадак англійскага гандлю пры адначасным узросьце амэрыканскага і часткова японскага. Гэтак для Англіі справа ўжо йдзе навет не аб захаваньне пяршынства свайго гандлю ў сьвеце, а проста аб самае захаваньне магчымасьці для існаваньня яе гандлю.

Вось у якое палажэньне трапіў англійскі гандаль у выніку сусьветнай вайны.

Сымон Б.

(Працяг будзе).

З канфэрэнцыі між-парляманцкага аб'яднаньня.

Канфэрэнцыя прадстаўнікоў эўрапэйскіх парлямантаў, якая ўжо стала зьбіраецца пэрыядычна на паразумеўчыя гутаркі — побач з канфэрэнцыямі прадстаўнікоў урадаў тых-жа дзяржаў, сабралася і сёлета—якраз перад Агульным Зборам Лігі Народаў.

Як ведама, народныя прадстаўнікі, належучы да розных партыяў, незаўсёды ўрадавых, могуць з большай свабодай (—бо з меншай адказнасьцяй!) гутарыць публічна, высоўваючы розныя думкі ды пажаданьні ў справах міжнародавай палітыкі і ўзаемнага паразуменьня народаў — шляхам узаемных уступак. Але-ж ведама, што кожная з буржуазных партыяў, не выключаючы і сучасных „сацыялістаў“, мае заўсёды пратэнсіі гутарыць „ад імя ўсяго народу“—„нацыі“. Дзеля таго наагул на гэтых міжпарляманцкіх канфэрэнцыях безадказных прадстаўнікоў „народаў“ звычайна ня бывае рэзкай супярэчнасьці з палітыкай, якую вядуць адказныя прадстаўнікі дзяржаваў — урады ці іх міністры. Наадварот, гэтыя міжпарляманцкія канфэрэнцыі заўсёды маюць заданьнем памагаць сваім урадам весьці „нацыянальную палітыку“, — памагаць перадусім „свабодным і шчырым“ высьвятленьнем, „нацыянальных інтарэсаў і імкненьняў“, а ужо на гэтай падставе адказныя ўрады павінны весьці якраз тую палітыку, якую... вядуць! Так зьдзяйсьняюць „нацыянальныя парляманты“ сучаснай Эўропы задачу „агульнага збліжэньня народаў“. Ясна, што гэткае „збліжэньне“ ня мае нічога супольнага з тым запраўдным аб'яднаньнем працоўных, якое мае на мэце запраўдны сацыялізм...

Найлепшай ілюстрацыяй усяго сказанага зьяўляецца той характэрны канфлікт, які ўзьняўся на апошняй „канфэрэнцыі парлямантарыяў“ між немцамі і французамі...

Як ведама, першым крокам да запраўднага, шчырага паразуменьня і збліжэньня між народамі, а тым болей між учарашнімі ворагамі — французамі й немцамі — было б бязумоўнае ды безадкладнае скасаваньне акупацыі французамі часткі нямецкае зямлі. У гэткім духу, дый вельмі стрымана і спакойна, прамаўлялі на канфэрэнцыі нямецкія парлямантарыі з старшынёй нямецкага Рэйхстагу (Сойму) Лебэ на чале. Лебэ заявіў, што Нямеччына гатова прыняць тое што далі ёй цяпер у справе зьмяншэньня акупацыі яе тэрыторыі саюзьнікі, але лічыць, што было-б з усіх бакоў ды пагляда́ў добра, каб не пазьней, як 1 га студзеня новага году, акупацыя была скасавана зусім. Бо няма большай небясьпекі для міру, як утрыманьне гэтай акупацыі.

Гэтага было даволі, каб... выклікаць буру сярод дэлегатаў францускага парлямантарызму! Адзін з іх, сэн. Жувэнэль, — той самы, які толькі што выйшаў з складу дэлегацыі Францыі ў Лізе Народаў — за тое, што гэтая Ліга ўмывае рукі ў-ва ўсіх запраўды пагражаючых сусьветнай вайной канфліктах, — гэты самы Жувэнэль накінуўся на нямецкага дэлегата дый на ўсю Нямеччыну — за яе „нячуванае дамаганьне“ скасаваньня акупацыі, якая толькі адна і падтрымлівае... мір у Эўропе дый на ўсім сьвеце...

Але п. Жувэнэль, захопліваючыся палемікай з п. Лебэ, даў у сутнасьці надзвычайна рэзкую і трафную характэрыстыку тэй самай „Вэрсальскай Эўропы“, якую стварыла Францыя — перадусім з мэтай ратаваць ды забясьпечыць штучнымі спосабамі сябе і сваю паваенную ролю і сілу.

Дэлегат Францыі сьцьвярдзіў, што запраўдны мір у Эўропе можа быць асягнуты толькі пад варункам „гаспадарчага разбраеньня“. „Калі ў сучаснай Эўропе (створанай у Вэрсалі!), якая нарабіла ў сябе новых граніц між дзяржавамі на 7 тысячаў кілямэтраў больш, як было ў 1914 г., кожны народ будзе апіраць сваю палітычную незалежнасьць на „незалежнасьці гаспадарчай“, калі ўсе свае сілы будзе аддаваць на варыхтоўку абароны сваіх граніц, ...дык ня трэба дзівіцца, што агульная прадукцыя ў гэтай Эўропе панізілася на 10 працэнтаў. Больш таго: тады нельга на абшары ўсей Эўропы, ахопленай страхам перад пагрозай вайны, зьменшыць цяжары на войска, якія павялічыліся ўжо агулам на 20 працэнтаў... Але і гэтага мала. Нічога, ня будзе дзіўнага, калі — душачыся за гэтымі эканамічнымі мурамі, якія ён сам навакол сябе ўзьнёс, той ці іншы народ ня вытрывае. І ў адзін харошы дзень убачыць у вайне — адзіны пакінуты яму спосаб прабіць гэты мур, каб набраць паветра, ці — знайсьці сабе рынкі дзеля збыту... Тасаваньне ў гаспадарчым жыцьці ваенных спосабаў з няўхільнасьцяй вядзе да няўхільнай вайны“.

Так горача і слушна казаў пан Жувэнэль — быццам проці Нямеччыны, а ўзапраўднасьці, сам таго не заўважаючы, — проці тэй самай сваей Францыі, якой па праву належыцца амаль не цалкам уся ўдзячнасьць Эўропы за стварэньне ў ёй такога ваенна-гаспадарчага ладу — у выніку нарабленых 7 тысячаў кілям. новых дзяржаўных граніцаў, якія ня толькі знаходзяцца ў супярэчнасьці з гаспадарчымі варункамі паасобных краёў, але яшчэ і рэжуць на кускі непадзельныя нацыянальныя ды гаспадарчыя народна-тэрыторыяльныя арганізмы на карысьць чыста ваенна-палітычных мэтаў францускай палітыкі...

Слушна казаў п. Жувэнэль аб тым, што ваенная небясьпека цяпер ня можа быць „лёкалізавана“—абмяжавана да аднаго пэўнага мейсца, дзе выбухне мясцовы канфлікт: кожны мясцовы канфлікт зараз-жа перакінецца на ўсю Эўропу, выклікаўшы агульны пажар... Так было і ў 1914 г.—перад вайной: мясцовы канфлікт між Сэрбіяй і Аўстрыяй зараз-жа перакінуўся на тлеўшую ціхім скрытым, падпольным пажарам лінію Рэйну, запаліўшы першым чынам старую—ад 1861 г.—спорку Нямеччыны з Францыяй аб Эльзас і Летарынгію... Як ведама, нямецкага „захвату ваенным гвалтам“ сваіх правінцыяў Францыя не забылася немцам у працягу больш, як 40 гадоў—і вось адабрала такі-ж—сваё... Чаму-ж яна так ужо трэбуе, каб немцы залішне лёгка ды хутка адмовіліся ад свайго—цяпер?! Сам Жувэнэль прызнае, што ў Лёкарно Эўропа была падзелена на „дзьве Эўропы—Заходнюю, дзе тэрытарыяльны стан быў загарантаваны, і—Усходнюю, дзе граніцы ня былі прызнаны аканчальна“. Ня былі прызнаны ўсімі ж учасьнікамі Лёкарнскіх трактатаў, паміж імі і—Францыяй ды Польшчай...

„Існуюць, значыць, „два міры“: заходні мір, які гарантуе існуючы лад, ды пад якім стаяць падпісы ўсіх вялікіх дзяржаваў, і — усходні мір, пад якім няма падпісаў ані Англіі, ані Італіі“...

Дык вось — Нямеччына вінавата, што няма падпісаў Англіі і Італіі пад трактатам, які гарантуе польскія граніцы...

Няма, відаць, затым, што мо' і ня можна гарантаваць іх рэальна...

Дык можа найлепш было-б — дзеля запраўднага захаваньня міру і на ўсходзе Эўропы — папросту пашукаць гэтых рэальных гарантыяў, пашукаць — пад якімі варункамі згодзяцца пад гэтым „усходнім мірам“ паставіць свае падпісы Англія, Італія і — Нямеччына, калі не казаць аб іншых—ня менш важных—падпісах—мо' з боку Усходу. А—дагэтуль, трэба папросту шчыра прызнаць—побач з п. Жувэнэлем, што тыя падпісы, якія ёсьць пад гэтым „усходнім мірам“, запраўды ж не гарантуюць яго рэальна...

Забываючыся зрабіць усе неабходныя вывады з сваіх жа слоў, сэн. Жувэнэль страшэнна нападае на Нямеччыну — за тое, што яна—шукае апоры для сваіх патаптаных саюзьнікамі правоў—у трактаце з СССР.—„Калі п. Лебэ кажа нам: „скасуйце акупацыю на 1 студня 1928 году“, мы можам на гэта адказаць толькі адно: „ваенная акупацыя Рэйну—можа адзіная гарантыя эўрапэйскага міру, бо яна адна толькі рэальна не дазваляе Нямеччыне рыпнуць новай вайной на Усходзе Эўропы — проці нашых саюзьнікаў палякоў“...

Чаму толькі п. Жувэнэль заяўляе у канцы, што ён сам „шчыра жадаў-бы скасаваньня акупацыі — пад варункам адзінага адналітага міру ў Эўропе“?! З яго слоў выходзіць — якраз наадварот: акупацыя ня можа быць спынена ніколі, але павінна трываць вечна, як сталы чыньнік, як адзіная гарантыя міру ў Эўропе... Вось у гэтым і ёсьць нерэальнасьць і недарэчнасьць усіх яго разважаньняў і мяркаваньняў.

Камэдыя усенароднага галасаваньня.

(Да справы зьмены канстытуцыі ў Літве).

Як ведама, літоўскі фашыстаўскі ўрад мае́цца зьмяніць канстытуцыю — перадусім, каб „манархізаваць“ уладу „прэзыдэнта“, якога мае далей выбіраць народ асобным галасаваньнем, даючы яму гэтак „поўную незалежнасьць ад парляманту“... Але, захапіўшы ўладу звычайным гвалтам—замахам, як гэта цяпер у такой модзе ў сьвеце, літоўскія паны палажэньня, як і дзе інш, таксама хочуць прыдаць „легальныя — канстытуцыйныя—формы“ свайму гвалту... Вось і Канстытуцыя мае быць зьменена шляхам „усенароднага галасаваньня“...

Паводле існуючай канстытуцыі Літвы, ўсялякія зьмены яе—у азначаным парадку—можа рабіць Сойм. Але справа ў тым, што Сойм байкатуецца літоўскімі фашыстамі, як і дзе інш. — Яго трымаюць пакуль-што бясчынным, бо баяцца новых выбараў, дый ня хочуць рабіць іх паводле старога выбарнага закону. Дык вось, сьпярша і трэба—шляхам выяўленьня „беспасярэдняй народнай волі“ паміма „партыйна-крывадушнага парляманту“—зьмяніць падставы Канстытуцыі. Але цікаўна: чаму-ж гэта фашыстам-замахоўцам так раптам палюбіўся „народ“, чаму гэта яны пачулі адразу такую пашану да „народнай волі“?!

І гэта — зусім ясна. Гэта выяўляецца перадусім з таго, як мае ісьці гэтае „беспасярэдняе ўсенароднае галасаваньне“...

Апрацаваная ўрадам інструкцыя для гэтага галасаваньня кажа, што галасаваньне адбываецца ня толькі „проста“, але і — яўна, адкрыта...—Кожны выбаршчык уваходзіць да „бюра“ і бярэ ад пасаджанага тутака ўрадоўца (можа—паліцыянта?!) картачку — з надпісамі: „за“ і „проці“, з якіх адзін надпіс выкрэсьляе на вачох урадоўца, каторы тутака сабе—„для памяці“ —мо' адзначае і ягонае прозьвішча... Вось і ўсё галасаваньне.—„Народ“ павінен толькі адказаць на пытаньні: ці ён прымае ўдзячна згары гатовую ужо, апрацаваную урадам, новую „Канстытуцыю“, ці—мае сьмеласьць яе адкінуць... А гэтым самым „народ“ мае высказацца: ці ён стаіць за „манархізаваньне“ ды легалізаваньне фактычных захватчыкаў улады ў Літве, ці наадварот — стаіць за цалком апазіцыйны да гэтай улады, выбраны народам Сойм і за яго загарантаваныя канстытуцыяй правы... І вось—агент гэтага ўраду будзе пільна сачыць за тым, як „народ“, як кожны паасобны грамадзянін, будзе вырашаць гэтае пытаньне свайго палітычнага сумленьня... Сачыць і — „дакладываць“ пасьля тым, „каму ведаць аб гэтым належыць“, як казалася калісьці ў царска-паліцэйскай Расеі...

Дык — ці-ж не агідная камэдыя гэтае „ўсенароднае галасаваньне“, да якога „з пашанай“ звараčаюцца, быццам да запраўднай „адзінай крыніцы дзяржаўнай улады“, тыя самыя гвалтаўнікі, якія за англійскія срыбнікі!—зрабілі ваенна-фашыстаўскі пераварот, зусім ня пытаючыся тады „аб суверэннай волі народу?!

БРАТЫ! НЕ ЗНІШТАЖАЙЦЕ СВАЕ БЕЛАРУСКАЕ ГАЗЭТЫ; ПРАЧЫТАУШЫ, АДДАЙЦЕ СУСЕДЗЯМ.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Перад новай сэсіяй Сойму і Сэнату.

Яшчэ дагэтуль прэзыдэнт Мосьціцкі не абвясьціў скліканьня надзвычайнае сэсіі ў адказ на дамаганьні ўстаноўленага Канстытуцыяй ліку паслоў і сэнатараў. Акт прэзыдэнта мае быць выданы ў астатні дзень азначанага канстытуцыяй тэрміну, г. з.— на чатырнаццты дзень ад моманту падачы дамаганьня ў канцэлярыі прэзыдэнта.

Калі-б гэта здарылася ў запраўднасьці, дык першае паседжаньне адбылося-бы ў палове верасьня.

Урад думае ўнесьці на новую надзвычайную сэсію дадатковы фінансавы закон — аб новых дадатковых выдатках ураду.

У колах, блізкіх да ўраду, выказываюцца пажаданьні, каб Сойм заняўся выключна дадатковым бюджэтам, а знача не чапаў бы справы прэсавага дэкрэту, зьмены канстытуцыі і г. д.

Ня ведама, як споўніцца гэтае пажаданьне ўраду і чым скончыцца гэтая надзвычайная сэсія.

Пачынаюць зьяжджацца.

У сувязі з надыходзячай сэсіяй пачалі пакрысе ўжо зьяжджацца ў Варшаву паны паслы і сэнаўнікі.

Прыехаў старшыня сэнату Трампчынскі. Зьбіраецца прыехаць у Варшаву з Друскенік Пілсудскі. Мае ў працягу гэтага тыдня адбыцца нарада Бартля з Пілсудскім у справе соймавай сэсіі. Прыехала пара соймавых лідэраў. — Адным словам, „агурковы час" у палітыцы пачынае мінаць.

Далейшае паляпшэньне стасункаў між Польшчай і СССР.

На падставе дакананага паразуменьня з радавым урадам, польская Рада Міністраў пастанавіла адчыніць у Маскве аддзел Польскага Тэлеграфнага Агенства—„ПАТ"-а.

Роспуск старых мястовых Радаў.

Як даведаўся „Роботнік", у хуткім часе распараджэньнем ураду маюць быць распушчаны—дзеля правядзеньня новых выбараў—цэлы рад мястовых радаў у местах былага „расейскага забору" — паміж іншым і ў Горадні.

„Рада аховы працы".

Сярод раду іншых „радаў", якіх штосьці ўжо каля дзесятку нарабіў сучасны ўрад, жадаючы неяк „вызваліцца" з-пад апекі парляманту, толькі-што пастановай Рады Міністраў створана і Рада аховы працы. Рада гэтая будзе існаваць „пры боку" міністра Працы і Сацыяльнай Аховы, як яго дарадчы орган. Пры гэтым міністэрстве існуюць ужо тры „рады", дык гэтая мае быць чацьвертай. У склад новай рады ўвойдзе аж 45 сяброў, паміж імі—спэцыялісты, фахоўцы—дактары, інжэнеры, эканамісты і інш.

„Вугальны разбой".

Пад такім загалоўкам „Роботнік" зьмяшчае заметку аб далейшым падаражэньні каменнага вугальля. Толькі-што вугальныя бароны, ня пытаючыся ўрадавага дазволу, самавольна паднялі цану на 4 прац., а вось кракаўскія газэты даведаліся, што ад 1 верасьня вугальле мае падаражэць яшчэ аж на 15 прац... А пасьля—яшчэ, калі работнікі патрэбуюць падвышкі платы... Што гэта—запраўдны разбой з боку спэкулянтаў, няма сумліву, бо якраз тады, калі — пад зіму—вугальле робіцца прадметам першай патрэбы для шырокіх масаў спажыўцоў, спэкулянты дзяруць за яго вышэйшую цану, хаця якраз тады-ж яны наагул больш зарабляюць з прычыны масавай прадажы тавару. Ці дазволіць урад гэты разбой з рабункам сярод белага дня, пабачым.

„Маральная санацыя".

„Роботнік" падае наступны вельмі цікавы факт.

Некалькі месяцаў назад Сойм ухваліў устаў і знайшоў крэдыты на дапамогу сем'ям рэзэрвістаў, узятых на вайсковыя цьвічэньні. Гэта сталася супроць волі ўраду „маральнай санацыі". На аснове гэтага ўрад вызначыў дапамогу ў разьмеры... ад 90 грошы да 1 зл. 30 гр. Пасьля абвяшчэньня гэтай пастановы—аб выплатах дапамог ні слуху, ні духу! Ні абвестак, ні камунікатаў—нічагусенькі.

Аказываецца, даручана гэта было ў самой Варшаве Вайсковай сэкцыі камісара ўраду. Урадоўцы заказалі абвесткі, але—па загаду з цэнтру—спынілі друк набраных ужо адозваў. Гэткую-ж інструкцыю атрымалі ўрадоўцы і адносна да прэсы. На правінцыю і на Крэсы не дайшло навет простай заметкі ў гэтай справе. Ураду і гэткая дапамога сем'ям рэзэрвістаў—у ліку 90 грошаў—паказалася за-вялікай — у той-жа самы час, калі афіцэрам не за-шмат выплачываць амаль падвайныя пэнсі, раўнуючы да іншых урадоўцаў.

Заграніцай.

Завастрэньне англійска-радавай „вайны".

Маскоўская прэса вельмі востра рэагуе на „нафтавы тэрор" з боку англійскай нафтавай кампаніі і англійскага ўраду.

Як ведама, галоўны дырэктар англійска-галяндзкай кампаніі Рояль Дэтч-Шэль выпусьціў адозву да ўсяго сьвету, а перадусім — да ўраду і грамадзянства Галяндыі. У гэтай адозьве ён заклікае ўвесь сьвет, Амэрыку, а асабліва Галяндыю—байкатаваць радавую нафту, як „крадзеную", ці адабраную радавым урадам у яе законных уласьнікаў. Ад гэтай канфіскаты страціла Галяндыя нямешп, як і Англія. Далей гэты дырэктар страшыць галяндзкае грамадзянства тым, што грошы, выручаныя з прадажы нафты, радавы ўрад траціць пераважна на рэвалюцыйную прапаганду і агітацыю — асабліва ў калёніях, якім хоча памагчы вызваліцца ад пануючых над імі дзяржаваў. За нафтавыя грошы (даляры) радавы ўрад вядзе, як гэта выкрылася нядаўна, вялізарную паўстанчую працу ў галяндзкіх калёніях—на Яве, Суматры, Борнэо і інш., каб павыбіваць там усіх галяндцаў.—І г. д. у тым-жа духу разводзіць гэты „маніфэст", які ад імя англійскай кампаніі абвяшчае нафтавую вайну радава-амэрыканскай, якая пагражае англійскай манаполіі на ўсім сьвеце.

Няменш цікаўнай азнакай завастрэньня на англійска-радавым фроньце зьяўляецца грозная заява галоўнага камандзіра англійскай акупацыйнай арміі ў Індыі, ген. Бэрвуда, які сьцьвярдзіў нядаўна ў сваей прамове немагчымасьць сусьветнага разбраеньня народаў, а перадусім—вываду англійскіх войск з Індыі (чаго страшэнна, відаць, хацелася-б добрым англійцам?!)—датуль, пакуль Радавая Расея не адмовіцца ад сваіх цяперашніх палітычных мэтаў і спосабаў вядзеньня палітыкі.

Белы тэрор у Францыі.

Саро, міністар унутраных спраў, дакладываў у пятніцу на нарадзе міністраў аб сваей барацьбе з камунізмам і вызвольным работніцкім рухам наагул.

У 1924, 1925 і 1926 г. г. высылалася ў сярэднім з Францыі 6.000 чужаземных работнікаў, западозраных у палітычнай дзейнасьці, гэта знача: проста стараўшыхся направіць жахлівае матар'яльнае палажэньне чужаземных работнікаў, пастаўленых па за рамкі францускіх законаў аб працы, ды пазбаўленых амаль усякае праўнае абароны наагул і выданых—дзякуючы няведаньню мовы—на поўную самаволю францускіх фабрыкантаў.

У 1927 годзе, гэта знача: за няпоўны год! — выселена панам Саро ўжо 8.500 работнікаў.

Далей пан Саро хваліцца, што амаль кожны дзень робяцца вобыскі ў камуністаў. Паводле слоў пана міністра, часта здараюцца арышты, і шмат „небясьпечных" асоб сядзяць за кратамі. У апошнім часе арыштаваны ў самым Парыжы 14 правадыроў камунізму і 30 асоб на правінцыі, абвінавачаных у проці-вайсковых прамовах і пашырэньні гэткіх-жа друкаў. Ідуць 52 палітычныя працэсы. За ўчасьце ў дэманстрацыях з прычыны казьні Сакко і Ванцэтті засуджаны 36 асоб у адным толькі Парыжы. Кара даходзе да $1^1/_2$ году. Проці 11 асоб у тэй жа справе суд яшчэ не адбыўся. Зачынены 19 газэт. Пан міністар думае, што гэтыя меры далі добрыя вынікі.

Аднак, прэса буржуазнай лявіцы зазначае, што гэта ўсё выклікала сярод работнікаў ня страх, а наадварот, гнеў і заядласьць, і радзіць ураду лішне не сьпяшацца...

Камуністычнага пасла Марті за апублікаваньне адкрытага пісьма да маршалка Фоша, не сканфіскаванага цэнзурай, пазбавілі ўсіх правоў палітычнага вязьня, адняўшы ад яго кнігі, газэты і пісьменныя прылады. Яго трымаюць на палажэньні крымінальнага, гэта выклікала навет пратэст Лігі Правоў Чалавека. Урад на гэта адказвае, што на крымінальным палажэньні пасла ня трымаюць, але пазбавілі некаторых правоў.

Ува ўсей Францыі адбываюцца пратэсты з прычыны пазбаўленьня Марті правоў палітычнага вязьня бяз жадных падстаў і супроць падобных езуіцкіх выкрутасаў ураду.

Пратэст францускага ўраду.

ПАТ паведамляе, што францускі ўрад апублікаваў ноту пратэсту з прычыны подпісу Ракоўскага, радавага пасла ў Францыі, пад адозвай III Інтэрнацыяналу. Адозва гэтая прызывае грамадзян дзяржаў, якія-бы знаходзіліся ў вайне з СССР, да ўчынкаў, якія-бы давялі гэтыя дзяржавы да паражэньня, а іменна: да забастовак, сабатажу і інш. Далей гэтая адозва прызывае салдатаў да пераходу на бок чырвонай арміі і да аружнай абароны СССР.

Францускі ўрад пратэстуе проці таго, што прадстаўнік СССР вядзе бунтаўнічую агітацыю на тэрыторыі Францыі, якая жыве ў мірных адносінах з Радавым Саюзам.

З таго, як францускі ўрад аднёсься да адозвы камінтэрну, відаць, наскол́ькі шчырымі і прыхільнымі ўзапраўднасьці зьяўляюцца адносіны Францыі да СССР, калі яна пратэстуе супраць подпісу на адозьве, маючай на мэце абарону Радавага Саюза ад яўных ворагаў яго! Чуе кот, чые сала зьеў, як кажа прыказка.

Як паведамляе ПАТ, Радавы ўрад паведаміў урад пана Пуанкарэ аб нагане, вынесенай Ракоўскаму, што ён, будучы прадстаўніком радавага ўраду, падпісаў адозву Камінтэрну.

Японія „выводзіць свае войскі з Кітаю".

Японскія афіцыяльныя крыніцы абвясьцілі, што Дзяржаўная Рада Японіі пастанавіла вывесьці з Кітаю свае войскі.

Справа, аднак-жа, ідзе толькі аб вывадзе тых 4.000 жаўнераў, якія ў траўні сёлетняга году былі кінуты на падмогу Чанг-Тсо-Ліну, калі яго гнаў Чанг-Кай-Шэк. Тады Японія высадзіла ў сваей асадзе і крэпасьці Цін-Таў гэтых 4.000 жаўнераў — дадаткова...

Дык ясна, што няма навет мовы аб запраўдным „вывадзе японскіх войскаў з Кітаю наагул.

Новая вестка аб Чанг-Тсо-Ліне—імпэратары.

Паводле апошняй весткі, Чанг-Тсо-Лін мае скасаваць рэспубліканскі лад у Кітаі, адбудаваўшы там манархію.

Ці ж трэба дадаваць, што першым уваскросшым „кітайскім імпэратарам" мае быць сам былы „хунхуз" (разбойнік-галаварэз на бальшакох), японскі папіхач — Чан-Тсо-Лін?!

Перамога рэвалюцыйнае арміі.

У баёх пад Нанкінам рэвалюцыйная (паўдзённая) армія разьбіла паўночную і ўзяла ў палон 10.000 жаўнераў, якія залічаны да рэвалюцыйных войск. Расстраляны 4 паўночныя генаралы чангтсолінаўскай арміі.

Новы рэкорд амэрыканскага лятуна.

Трэці амэрыканскі лятун дакакаў новага пералёту праз Атлянтыцкі акіян — у працягу 23 гадзін. Абодва папярэднія пералёты амэрыканцаў адбыліся, як ведама,—у 44 і 56 гадзін.

Гэткім чынам самалёт ляцеў з хуткасьцяй звыш 200 кілямэтраў у гадзіну. А вось, толькі-што пабудаваны англійскі ваенны самалёт новага тыпу быццам можа разьвіць хуткасьць 480 кілямэтраў у гадзіну.

Люблю мой край.

Люблю мой край, старонку родну
Душой юнацкаю кахаю;
Спаліў-бы хмару яе збродну, —
Ды жаль, што сіл ў грудзёх ня маю.
Люблю палі, лясы, сады,
Яе прыгожую прыроду;
Ляцеў-бы ў далеч я туды,
Знайшоў-бы волю для народу...
Люблю я рэчкі і вазёры,
Лясы цудоўныя — густыя;
З красой бязьмежныя прасторы
І з збожжам нівы залатыя.
Люблю сьпеў птушачак вясёлы
З мядовым пахам ночы мая...
Калі ж зраўнуюцца гандолы
Жыцьця і зьнікне чорна зграя?!
Люблю я працу тых людзей,
Што з потам родзіцца, з сьлязамі, —
І сэрцам поўны я надзей,
Што збаўчы сьвет не за гарамі...
Люблю мой край, браткі — і вас,
Хто верыць, што старонка родна
Прыжджэ жаданы ясны час
І зацьвіце жыцьцём свабодным!

Мік. Карчаноўскі.

ХРОНІКА.

Міжнародавы Дзень Моладзі ў Вільні. У мінулую нядзелю — у сувязі з сьвяткаваньнем на ўсім сьвеце „Дня Моладзі" — ладзіліся вулічныя маніфэстацыі камуністычнае моладзі ў Вільні. Аднак, як падаюць віленскія газэты, інфармаваныя паліцыйнымі ўладамі, толькі ў адным месцы маніфэстантам удалося сабрацца ў вялікшым ліку і прайсьці з Ноўгародзкай вул. на Завальную, нясучы транспаранты з „антыпаньствовымі" надпісамі. Тут—каля жыдоўскае бальніцы—адбылася сутычка з паліцыяй, у часе якое адзін з маніфэстантаў, Давід Фэльчар, быў ранены шабляй у галаву. Паліцыя заарыштавала колькінаццаць учасьнікаў маніфэстацыі.

Усе другія спробы камуністычнае моладзі сабрацца ў іншых пунктах места былі разьбіваны паліцыяй, якая загадзя прыгатавалася да гэтага.

Новая хваля арыштаў. Газэты паведамляюць аб цэлай хвалі новых арыштаў сярод беларусаў у Заходняй Беларусі.

Гэтак у Горадні, як падае „Газ. Варш. Пор.", заарыштаваны 4 жаўнеры беларусы, якіх вінавацяць у вядзеньні камуністычнае прапаганды ў войску. Яны перавезены ў Вільню ў сьледчы вастрог на Антокалі.

Ізноў-жа рад арыштаў адбыўся ў Наваградзкім ваяводзтве. Паводле газэтных вестак, выкрыты нелегальна існаваўшыя гурткі Грамады(?), якія, аднак, займаліся не грамадаўскай работай а — шпіянажам на карысьць СССР (дык пры чым тут Грамада?). На аднэй з вялікшых станцыяў ваяводзтва арыштаваны некалькі ўрадоўцаў чыгункі. Адзін з іх быццам даваў суседняй дзяржаве матэрыялы аб стане польскіх чыгунак...

Але-ж пры чым тут беларусы і Грамада? Ведама, што сярод польскіх урадоўцаў беларусаў так добра, як зусім няма, — а тут аж некалькі іх апынулася на аднэй толькі станцыі!

Дагэтуль з шпіёнскімі справамі былі зьвязаны пераважна чыста польскія імёны. Ці не затым газэты не падаюць іменьняў арыштаваных цяпер асоб—пад відам грамадаўцаў?

Разгром Віленскае Беларускае Гімназіі йдзе далей. Сёлета польскія школьныя ўлады—у паразуменьні з палітычнай адміністрацыяй — недапусьцілі да выкладаньня ў Віленскай Беларускай Гімназіі ажно пяцёх вучыцялёў, як „неблаганадзёжных": Заморына, Луцкевіча, Савіцкага, Сіняўскага і Шырму. Апрача таго, яшчэ чацьвёра знаходзіцца пад знакам запытаньня...

Багатыя мусяць быць беларусы культурнымі сіламі, каб вясьці свае гімназіі: на кожную трэба мець пару камплектаў вучыцялёў, з якіх мае рабіць выбар... дэфэнзыва!

Сельсаюзьнікі Ярэміча паказалі сваё аблічча! Мы ўжо адзначалі рашучы паварот органу польскіх „дэмакратаў" — пілсудчыкаў „Кур. Віл." у адносінах да ярэмічавае банды. Сьпярша газэта зьмяшчала праўдзівыя інфармацыі аб ярэмічавых сельсаюзьніках. Але вось неўспадзеўкі вярнуўся ў рэд. „Кур. Віл." знамяніты Сьветазар, гадунец кс. Станкевіча і Ярэміча, ён-жа — Смрэчыньскі і аўтар друкаваных у „Слове" агідных, чыста дэфэнзыўных ілжывых даносаў на незалежных беларускіх дзеячоў; вярнуўся на старое становішча, з якога быў выдалены, і ўраз-жа пачалі друкавацца ў газэце стацьці на карысьць ксяндзоўска-ярэміцкае работы.

Што адносіны пілсудчыкаў да сельсаюзьніцкай „тройкі" (Ярэміча, Рагулі і Більдзюкевіча) зьмяніліся ня так сабе — бяз дай прычыны, аб гэтым сьведчыць паданая ў тым-жа „Кур. Віл." вестка з Радашкавіч. Тамака незалежныя беларускія дзеячы ўтварылі свой выбарны камітэт—дзеля выбараў у мястовы самаўрад. Вось-жа сельсаюзьнікі з Більдзюкевічам на чале зрабілі зноў з пілсудчыкамі і—абвясьціўшы незалежны беларускі сьпісак „грамадаўскім" — пачалі проці яго барацьбу, злучыўшыся з польскім камітэтам.

Так выглядае запраўднае аблічча гэнае кумпаніі палітычных спэкулянтаў, пазбаўленых сумленьня і ўсялякае ідэі, апрача аднае: за ўсякую цану зрабіць палітычную кар'еру. І вось, яны вядуць барацьбу з кожным самастойным выступленьнем працоўных беларусаў — у Вільні ў хаўрусе з маскоўшчынай, у Радашкавічах — з пілсудчынай....

Спэктакль-вечарына — адчыненьне зімняга сэзону. У суботу 10-га верасьня 1927 г. Тэатральная Сэкцыя Навасьвецкага Гуртка Т-ва Белар. Школы ладзе спэктакль-вечарыну ў памешканьні Цэнтр. Гуртка Т-ва Бел. Школы (вул. Сьв.-Ганны 2 — 3) гдзе будзе сыграна на сцэне: 1) дзьве камэдыі, 2) дэклямацыі, 3) струнны аркестр, 4) скокі—пад духавы аркестр, 5) лятучая пошта, 6) буфэт.

Пачатак у 8 гадз. увечары. Уваход па запросінах.

Пакаранае хуліганства. У суботу, 3 га верасьня, паміж 12 і 1-ай гадз. дня, перад домам ваяводзтва ў Вільні ведамы „доктар" Паўлюкевіч падыйшоў да д-ра Яна Станкевіча і пачаў пагражаць кулачнай расправай за тое, што д-р Станкевіч, сустрэўшыся з ім за гадзіну перад тым у гмаху ваяводзтва, адмовіўся прыняць працягненую яму Паўлюкевічам дзеля прывітаньня руку. У мамэнт, калі Паўлюкевіч хацеў ад слоў перайсьці да дзела і замахнуўся на д-ра Станкевіча, сам ён дастаў ад апошняга такі ўдар нагой у бруха, што ледзь удзяржаўся на нагах, апіраючыся аб мур. На гэта падыйшоў паліцыянт, які тут дзяжурыў, ды якому д-р Станкевіч заявіў, што быў прымушаны бараніцца ад нападу на яго з боку Паўлюкевіча. На гэта Паўлюкевіч сказаў, што гэта ён зьняважыў д-ра Станкевіча, — ды ў той самы мамэнт у прысутнасьці і на вачох паліцыянта д-р Станкевіч удэрыў яго з усяго размаху па твару.

Гэтак старонньік кулачнае расправы сам-жа аказаўся пацярпеўшым, атрымаўшы на месцы кару за свой бандыцкі напад на чалавека, які меў адвагу ўхіліцца ад падачы Паўлюкевічу рукі.

Зараз зьнекуль на возьніку пад'ехаў ня менш за Паўлюкевіча ведамы Вярнікоўскі і забраў свайго кумпана з сабою.

Характэрна, што абшарніцкае „Słowo" і эндэцкі „Dz. Wil." зьмясьцілі назаўтра ілжывыя апісаньні выпадку, які адбыўся на вачох „нядрэмлючае ўлады". Трэба думаць, што паінфармаваў газэты ў памысным для сябе духу сам пан Паўлюкевіч.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Дазвольце падаць да агульнага ведама наступнае.

Сельсаюзьніцкая „Сял. Ніва", якая сыстэматычна зьмяшчала аба мне самую агідную ілжу і хуліганскую лаянку, манючыся гэтым спосабам—праз маю асобу—апаганіць і маю ідэалёгію, цяпер—зусім неўспадзеўкі—прабуе прыпісаць мне... сваю-ж сельсаюзьніцкую ідэалёгію! Бо ж у № 62 з 27 жніўня с. г. заяўляе, быццам другі сельсаюзьніцкі орган „Народ", які служыць тэй-жа ідэалёгіі, што і „Сял. Ніва", толькі не прызнае ксяндзоўска-ярэміцкага павадырства над сабой,—выйшаў „дзякуючы грашовай дапамозе з асабістых сум Луцкевіча".

Ня буду затрымлівацца на чыста шпікоўскіх мэтадах данюхівацца, хто ад каго дастае грошы; скажу толькі, што западозрыць мяне ў дапамозе грашмі сельсаюзьніцкай газэце могуць толькі такія бязыдэйныя „дзеячы", як выдаўцы „Сял. Нівы". Я прынцыпова лічу сельсаюзьніцкую ідэалёгію—абмылковай і пабудаванай на фальшывых падставах,—дык, калі б навет і меў магчымасьць гэта зрабіць, ніколі-б не даваў дапамог грашмі ідэйна варожай мне часопісі.

Ант. Луцкевіч.

Вільня, 2/IX. 27.

З жыцьця Горадні.

× **Забастоўка сернікавай фабрыкі.** Больш пяцідзесяці дзён бастуюць работнікі Горадзенскай сярнікавай фабрыкі. Дырэкцыя фабрыкі, абвясьціўшы лёкаўт ня йдзе на задавальненьне дамаганьняў, выстаўленых бастуючымі работнікамі. Праз гэта стопяцьдзесят работнікаў і работніц са сваімі сем'ямі прысуджаны на галоднае існаваньне. Але бастуючыя работнікі, ня гледзячы на цяжкі стан, выказаліся за прадаўжэньне пачатай барацьбы да таго часу, пакуль іх дамаганьні ня будуць задаволены.

Прымаючы гэта пад увагу, забастовачны камітэт рашуча і цьвёрда выказаўся за далейшае вядзеньне забастоўкі, бо лепей сьмерць, чым на жабрацкіх варунках аплаты станавіцца да працы. Ня гледзячы на тое, што работнікі і сяляне Горадзеншчыны на меры магчымасьці падтрымліваюць бастуючых работнікаў, а таксама надходзяць ахвяры ад работнікаў Пінскай, Стрыйскай і Варшаўскай сярніковых фабрык. Але з прычыны таго, што гэтае дапамогі не хапае для стварэньня тых належных варункаў, у якіх можна было-б весьці барацьбу, агульнае сабраньне бастуючых работнікаў заклікае Цэнтральны Урад Прафсаюзаў Хімікаў у Чэхавіцах да наступнага:

1. Зьвярнуцца да ўсіх работнікаў хімічнай прамысловасьці дзеля стварэньня арганізацыі дапамогі Горадзенскім работнікам сярніковай фабрыкі;

2. Прыступіць да арганізацыі агульнай забастоўкі хімічнай прамысловасьці ў знак салідарнасьці з бастуючымі горадзенскімі хімікамі.

Чым кончыцца забастоўка, накажа будучыня.

З Беластоцкага жыцьця.

Як яны вызыскуюць.

Як фабрыканты вызыскуюць ня толькі нашых работнікаў, але і сялян, паказуе наступнае.

Есьць тутака ў Беластоку фабрыка сельска-гаспадарскіх машын. Канкурэнцыі мяйсцовай няма, і фабрыка гэтая прадае свае зямляробскія прылады на мейсцы. Працуе ў фабрыцы 25 рамесьнікаў, на кожнага з якіх выпадае адзін дармаед, бо фірма мае аж 20 супольнікаў (амаль ня ўсе яны былі раней тракцірщчыкамі).

Вызыск пэнуе страшэнны. Найлепшы рамесьнік за працу (8 гадзін) дастае ад 6 да 7 злотых у дзень, — але гэта вынятні: большая частка працуе за 2—4 зл., а навет ад 1 да 1½ злот. Усе работнікі—беларусы.

А з купляючых машыны—сялян, ізноўжа беларусаў,—фабрыканты лупяць апошнюю скуру, бо пэўны, што селянін купіць: канкурэнцыі няма!

Дзеля прыкладу падаю цэны некаторых машын:

малатарня прадаецца за 320 зл., а сабе каштуе з матэрыялам і работай ад 80 да 100 зл.;

манеж (кірат) прадаюць за 500 зл., а сабекошт—180—200;

прылада да часаньня воўны прадаецца за 150 даляраў, а сабекошт—400 злот.; дый няма тэй прылады, якая не дала-бы ў сярэднім 200% зыску.

Можна мяркаваць з гэтага, якія зыскі цягнуць кулакі з сялян і работнікаў!

Работнік.

Выбары у Самаурады.

Выбары ў гмінную раду.

(Казлоўская гміна).

Дзьве вялікія бяспадзянкі прынёс нам дзень 12-га чэрвеня. Першая—гэта раптоўна наляцеўшая страшэнная навальніца, якая ў нашай гміне зьнішчожыла некалькі вёсак і другая—раптоўна вызначаныя на гэты дзень выбары, за тры дні да якіх былі апавешчаныя солтысы, а большая частка людзей даведалася аб іх толькі ў апошні дзень.

Ня было часу ні абгаварыць ні абрадзіць так паважнай справы. А што яна паважная, аб гэтым гаварылі навет і тыя, што мала ў гэтым разьбіраліся і навет можа не разьбіраюцца, а ведаюць адно толькі, што войта трэба перамяніць. Даўно ён сядзіць у касьцёх кожнага, даўно шукалі парады адзін у другога, як палажыць крэс яго сваволі. І вось, калі надышла магчымасьць скінуць з сябе ярмо, яна была так раптоўная, як і наляцеўшая навальніца.

Выбары былі вызначаны на нядзелю, а ў суботу вечарам яшчэ ніхто аб іх ня ведаў. Ведалі толькі з газэт, што маюць быць перавыбары ў гмінныя рады, таксама, як цяпер ведаем, што павінны быць некалі выбары і ў Сойм. Скажу цяпер некалькі слоў аб самых выбарах. Выбары былі вызначаны на 3 гадзіну ў нядзелю і ўся гміна падзелена на абводы. У нашым Нямадавіцкім абводзе мае права голасу каля 600 чалавек, а прышло толькі 96 чалавек. Рэшта, ці ня ведала аб выбарах, ці проста не хацела прымаць у іх удзелу. Было запрапанавана зрабіць сьпісак кандыдатаў на выбаршчыкаў і падаць яго, але сябра ст. гміннае рады Барук запярэчыў адразу, гаворачы, што будуць называць кандыдатаў, а потым галасаваць. Зрабілі сьпіскі ўсіх прысутных, а потым усіх выклікалі ці не засталося яшчэ каго. Усё было добра, пакуль-што. Народ варушыўся, абгаварываючы кандыдатаў. Сэрца радавалася, слухаючы, як вызначалі на кандыдатаў людзей больш сьвядомых, каб мог пастаяць за нас, каб добра ведаў нашы справы і нашае жыцьцё і ня быў падлюбезьнікам панскім, але чалавекам, які праўду ўсім скажа ў вочы. Раптам уваходзіць абшарнік з гэтага абводу з ксяндзом і сваімі служачымі, (усіх да аднаго пазабіраў з сабою). Абвясьцілі выбары. І калі сталі называць кандыдатаў, іх не захацелі запісваць, гаворачы, што ўперад будуць запісваць па сьпісках, якія ўжо пададзены. Падняўся шум. Чаму-ж нам казалі іначай. Мы ня бачылі, калі і хто падаваў гэтыя сьпіскі. Нічога не памагае. І аказаліся на сьпіску першымі кандыдатамі, у ліку 21 чалавека, усе тыя, каторых якраз народ і ня думаў ставіць. Сюды пазапісвалі ўсіх, каго толькі хацелі, абы болей: і сяброў ст. гмін. рады, так любае панам і самых паноў абшарнікаў, і падпанкаў, і ксяндза, запісалі нат' хворую на сухоты настаўніцу, акая гэтымі справамі зусім ня цікавіцца і на выбарах ня была. „Няхай і ў нас будзе хоць адна кабета", кажуць пры гэтым. Кандыдаты сялянскія былі зьмешчаны ў канцы сьпіску, а некатарыя засталіся толькі ў думках людзей. Пры лічбе галасоў махлявалі, як толькі падабалася. Калі на абшарніка было 24 галасы, налічылі 35. Сход стаў прасіць даць яшчэ аднаго чалавека, каб памагаў лічыць галасы, або зьмяніць на новага; старшыня гмін. рады — Белы, сказаў, што падлічаць выбраны гмінаю і перамяняць ня маем права. Але, калі дайшлі да кандыдатаў, выстаўленых сялянамі, лік галасоў у падлічаньні стаў відавочна зьмяншацца. Сход абурыўся і запатрабаваў пералічыць галасы апошняга кандыдата Б. Старшыня Белы сказаў, што ня маюць права пералічваць па другому разу, і пачаў чытаць далей кандыдатаў да галасаваньня. Сход стаяў на сваём. Падняўся шум і крыкі. Ня могучы спыніць сходу, які хацеў нат' выхадзіць з сабраньня, сталі прычапляцца да паасобных выбаршчыкаў. Ня ведама чаму, найболей прычапіліся да грамадзянкі Л. Мусіць дзеля таго, што на сходзе была толькі адна жанчына, якая вельмі кідалася ўсім у вочы, а галоўным чынам пану абшарніку. Села ні пала, захацела баба сала, так і радны наш Барук, каб як-колечы вытлумачыць недарэчнасьць, пачаў абзываць яе камуністкай і што яна была арыштаванай і дзеля таго, ня мае права голасу. Вышла па прыказцы: „апомніўся ў гарах, што трасца ў нагах". Калі народ усё ж такі дамагаўся пералічкі галасоў, старшыня Белы па радзе абшарніка Гарбовіча зачыніў сход, абвінавачваючы пры гэтым грам. Л., што сарвала сход. На заўтра была напісана просьба ў Выбарчы Камітэт, каб зрабілі перавыбары, на другі дзень на кірмашы, толькі і гутаркі было ў людзей, што аб выбарах. Па другіх абводах таксама не прайшло без канфліктаў. Проці выбараў у гмінную раду паноў абшарнікаў, паўлюкевічавых падпанкаў рэзка выказваліся больш сьвядомыя з народу. Прамоўцаў узялі на заметку.

Ня гледзячы на ўсе перашкоды і крутні, у гмінную раду прайшла большасьць сьвядомага сялянства, якое не папусьціць нашых інтарэсаў. Гэтыя выбары гэта школа, у якой павінен вучыцца селянін і работнік, як змагацца за свае правы да часу, калі ніякія махлярствы і крутні паноў і падпанкаў ня здолеюць перамагчы праўды і волі народнае.

Прысутны.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Каму радасна й мілосна, каму зайздросна і злосна.

У нядзелю, на сьвята 28-га жніўня, у вёсцы Вялікая Ліпа, Нясьвіжскага павету, пасьля царкоўнага фэсту была наладжана беларуская вечарына. На сцэне былі адыграны: Мікітаў лапаць і Боты. Народу было, як набіта, поўны магазын. Білетаў і мейсц не хапіла. Самая йгра і збор надта ўдаліся. Усе жаноцкія ролі выконвалі маладыя дзяўчаты. Усе яны пара гадоў, як павыходзілі з мяйсцовае беларускае школы. Цікава тут адзначыць, што ў Вялікай Ліпе беларускія вечарыны пачаліся адбывацца з 1919 года і без перарыву йдуць цэлых 7 гадоў. Тут у працягу 7 гадоў жыве беларуская пачатковая школа. Праца гэтае школы яскрава выдзяляецца на нашай Беларусі. Не адзін раз мне прыходзілася быць на Ліпаўскіх вечарынах, чуць і бачыць, як вучні беларускае мясцовае школы дэклямавалі прыгожа вершы і байкі ў асобах. Паміж дэкляматарамі былі навет 8 гадовыя дзеці. Апрача твораў вядомых беларускіх пісьменьнікаў, было найбольш твораў і перакладаў тутэйшага настаўніка беларуса, дзядзькі Язэпа. Ніводная вечарына не праходзіла без кіраўніцтва і ўдзелу дзядзькі Язэпа. Часта ён сам дэклямаваў свае вершы, апавядаў жарты, прыказкі й сьмяшыў усіх глядзельнікаў. На жаль на апошніх вечарынах ня было ні вершаў, ні баек, ні жартаўлівых апавяданьняў. Ці то дзядзька Язэп заленаваўся, ці то старасьць яго раптам апанавала, ці якія другія прычыны? Вялікая Ліпа, самая сьвядомая беларускае вёска ў нашай гміне, а мо' і ў цэлым павеце.

Ня дзіва, што Вялікая Ліпа атрымоўвае ўсе беларускія часопісі, часта-густа бачыш беларускі календар, чуеш беларускія песьні, бачыш беларускія танцы. У Ліпе ёсьць беларуская кніжніца, а ў апошнім годзе адчыніліся беларускія вечаровыя курсы для дарослых, куды з ахвотаю ходзяць ня толькі маладыя, а навет бацькі, людзі сярэдняга веку, дзе вучацца пісьму і роднай літэратурнай мове. Мне здаецца, што тут вялікі ўплыў робіць белар. школа. У ліпаўскай школе, акрамя шчырага бел. дз. Язэпа, працуе яшчэ двух настаўнікаў: адзін радавіты паляк, а другі тутэйшы беларус з прадвеку, але лічыць сябе паляком. Ось гэтыя настаўнікі вернуць усе на польскі бок і ні слова пабеларуску не загавораць да дзяцей. Дзіўлюся, нашто патрэбны такому настаўніку белар. курсы, калі ён бел. мовы ня хоча ўжываць і ня любіць? Але можна сьмела сказаць, што ўжо ніхто і ніякім спосабам не задушыць у Ліпе беларускага прабуджэньня, надта гучна стала адрастаць роднае карэньне, а беларуская родная школа, якое так прагавіта ўсюды дамагаюцца, нікому крыўды ня робіць. Ворагі ўсяго беларускага косым вокам пазіраюць і губы кусаюць.

Шчырае дзякуй вам Ліпаўцы за вашу школу, за вашы вечарыны, за вашых дзетак і іх працу.

Каму зайздросна і злосна, а каму радасна й мілосна!

Госьць бел. з-пад Сновi.

„З нашага жыцьця".

(В. Шэні, Пружанскага павету).

Мінула ўжо болей як 2 гады, ад тае пары, калі ў нашай вёсцы, апрача арыштаў, нічога болей і чуваць ня было. Гэтак званы „паляўнічы сэзон" скончыўся і наагул неяк усё супакоілася. „Камуністы" ў нашай вёсцы былі разагнаны, а калі й знаходзілася некалькі асоб, дык на іх такая была зьвернена ўвага, што яны часта былі змушаны пакінуць сваю „камуністычную працу" г. зн.: чытаньне беларускіх газэтаў, кніжак і г. д, а нашая паліцыя абмяжоўвалася пісаньнем пратаколаў за розныя дошчачкі, за сабакі, дык страляньнем па вёсцы вераб'ёў.

Усё здавалася, што спала. Але тут, як на ліха, прыехаў з Вільні матурыст Віленскае Беларускае Гімназіі, які, сабраўшы навакол сябе некалькі больш сьвядомых хлапцоў, пачаў арганізоўваць вясковую бібліатэку. На іх заклік адгукнулася яшчэ некалькі чалавек, якія ахвотна ахвяравалі свае кніжкі на карысьць агулу. Сабраўшы гэткім чынам больш чым 120 кніжак, (з якіх было каля 90 беларускіх), напісалі паданьне да мясцовага староства аб дазволе, а самі пачалі парадкаваць кніжкі, якія й былі зложаны ў асобнай шафцы паводле чародных нумароў.

Як потым выявілася, дорага заплаціла нашая моладзь за гэтую „камуністычную" дзейнасьць, бо данюхаўшыся аб ёй наш камандант пачаў уважна сачыць за больш сьвядомымі хлапцамі, а перадусім за Аляксандрам Засімам, які быў вызначаны часова на бібліатэкара і ў памешканьні якога знаходзіліся ўсе кніжкі. І вось-жа якраз ў нядзелю, калі ўсе кніжкі былі ўпарадкаваны, і напісана паданьне аб дазволе, па загаду павятовага каманданта і ў прысутнасьці нейкага рэфэрэнта палітычнай паліцыі, ноччу была зроблена рэвізыя памешканьня А. Засіма, які якраз быў адсутным, бо, як казалі яго бацькі, паехаў шукаць працы.

Агледзілі і абрэвідавалі нашыя „апякукуны" ўсе куты. Шафку з кніжкамі апячатавалі, набралі „kompromitującego" матар'ялу, (які складаўся з аднаго тому твораў Л. Андрэева Ньюёрскага дарагога выданьня, дамовай друкарні Гутэмбэрга, якую купіла моладзь і з якое зрабіла пячатку з надпісам: „гэтую кніжку ахвяраваў: (подпіс), дый аднаго кавалка бібулы.

Паліцыя дамагалася ад бацькі Ал. Засіма, каб ён сказаў, дзе сын і каго ён больш ведаець з „камуністаў". Яны пачалі пісаць пратакол, у якім напісалі, што ў памешканьні была знойдзена нелегальная конспіратыўная бібліатэка, што Ал. Засіма ня было дома таму, што паехаў на нейкае сабраньне, што была знойдзена ізноў такі нелегальная друкарня, якая складалася ўсяго-на-ўсяго з 80 літар па 2—3 кожнай і шмат, шмат чаго іншага.

Што ж было далей? Далей ужо ведама, што: злавілілі (як казаў камандант) недзе Аляксандра Засіма і пасадзілілі ў берасьцейскую турму, абвінавачваючы яго паводле 102 артыкулу Ч. I К. К.

Як ведама, 2 гады назад гэткі самы артыкул быў падстаўлены нашым хлапцом у ліку каля 20, за тое толькі, што яны зьбіралі дэклярацыі на беларускую школу.

Аднак, трэба цьвёрда верыць, што кожная ахвяра, падобная Аляксандру Засіму, — гэта ступень да вызваленьня.

Цярпеньнем, крывёю і сваім горкім потам здабудзем мы сябе свабоду і станем побач з другімі народамі, а з крыві поту і сьлёз мы збудуем сабе гмах — Вольную Сьветлую Беларусь!...

Дык адважна за працу!

Кастусь Змагар.

Змаганьне з культурнымі пачынаньнямі.

(З Лідчыны).

Да нашага кутка папала праз грамадзяніна Вінцука Кепэля заява (блянк) аб арганізацыі гуртка Таварыства Беларускае Школы. Заява гэта была дадзена солтысу Якубу Бандарчуку ў Малышох, каб дапамог тамака адчыніць гурток. Але солтыс—замест дапамогі сваім аднасяльчаным—панёс гэную заяву ў гміну і аддаў пісару, а той і даў ей „законы" ход: паліцыя кінулася рабіць у сялян вобыскі, шукаючы „крамолы" і „выўротовай" работы. Селяніна Івана Гарбіну з Вялікага Сяла былі навет заарыштавалі, і ён цэлы тыдзень—, самую рабочую пару—прабадзяўся па паліцэйскіх пастарунках. Паліцыянт Ліпінскі з пастарунку ў Вялікім Мажэйкаве зрабіў пратакол на Вінцука Кепэля.

Так польская адміністрацыя змагаецца з імкненьнем беларускіх сялян да працы на культурна-асьветным грунъце! Але сяляне ведаюць, што перасьледаваньне легальнае культурнае арганізацыі—гэта проста гвалт і беззаконьне, ды не баяцца ніякіх пагрозаў паліцыянтаў.

Лідзкі.

З Радавае Беларусі.

Жыцьцё нацыянальных меншасьцяў.

Нацыянальныя меншасьці ў Радавай Беларусі, як ведама, карыстаюцца ўсімі правамі нараўне з большасьцяй насяленьня—беларусамі. Асабліва вялікую культурна-нацыянальную працу вядуць у БСРР — пры падтрыманьні радавае ўлады—жыды і палякі — асабліва-ж апошнія, ня гледзячы на свой невялікі лік. Але й такія маленечкія групкі насяленьня, як літвіны і латышы, не адстаюць ад другіх у свай культурнай рабоце. Падаем ніжэй жменю вестак аб жыцьці літоўскае і латыскае калёніяў у Радавай Беларусі.

Сярод літвіноў.

Культурная праца сярод літвіноў, якія жывуць у Радавай Беларусі, распачэлася зусім нядаўна. Яшчэ ў 1925 годзе менскія літоўцы навет ня мелі свайго прытулку.

Плянавы характар гэтая праца набыла толькі ў пачатку 1926 г. Прыклад паказаў Менск. У клюбе імя Р. Люксэмбург літоўцы атрымалі асобны пакой, і праца забурліла. У культурную працу было ўцягнута 40 чалавек. Адразу ж утворана некалькі гурткоў, з якіх асабліва шырока выявіў сябе гурток па вывучэньні літоўскай мовы і па азнаямленьні з падзеямі ў Літве. Працавалі і іншыя гурткі.

„Літоўскі пакой" у клюбе ім. Р. Люксэмбург правёў вялізную працу. Часта ў ім наладжваліся розныя лекцыі, гутаркі.

Пры гэтым-жа пакоі працавалі літоўскія паэты, а іх у БСРР ня мала. Паэты аб'яднаны ў гурток. У ім яны разглядаюць свае творы і, наагул, творы выдатнейшых літоўскіх паэтаў.

Пры ўчасьці паэтаў Бел. Дзяржаўнае Выдавецтва выпусьціла зборнік літоўскіх рэвалюцыйных песень. Нядаўна ў Менску пачала выходзіць друкаваная літоўская газэта „Чырвоны Араты". Газэта выходзіць толькі трэці месяц, але яна ўжо пасьпела завязаць сабе і шырокі кадр рабкораў і чытачоў.

Але праца сярод літоўскага жыхарства ажыла ня толькі ў Менску. Зараз па Радавай Беларусі налічваецца звыш 20 пунктаў выключна з літоўскім жыхарствам. У гэтых пунктах 8 сваіх нацыянальных школ і некалькі хат-чытальняў,

Асабліва шырока разгарнулася праца сярод літоўцаў у Полаччыне. Тут ёсьць дзьве школы, чырвоны куток. Нядаўна ў акрузе праведзена некалькі канфэрэнцый літоўскіх сялян. Разглядаліся пытаньні аб нацыянальнай палітыцы і далейшых задачах культурнай працы.

Амаль на ўсіх канфэрэнцыях разглядаліся і пытаньні, як лепей паставіць сельскую гаспадарку.

Нядаўна ўтварылася новая літоўская калёнія ў б. Барысаўскай акрузе. Калёнія мае свой клюб, сваю школу, насьценную газэту.

Усёй культурнай працай сярод літоўцаў кіруе літоўскае бюро Нар. Кам. Асьветы. Літ. бюро рэгулярна высылае літаратуру і інструкцыі ў раёны.

З новага навучальнага году ў БСРР арганізуецца першая школа сялянскай моладзі для літоўцаў, а пры Белпэдтэхнікуме—курсы для маладых літоўскіх настаўнікаў.

Сярод латышоў.

Латыскае бюро пры НКАсьветы БСРР адчыняе новую латыскую школу.

Зараз у БСРР будзе тры школы. Для вучняў латыскіх школ выдаецца спэцыяльны лемантар.

Арганізуюцца тры новыя хаты-чытальні для латыскага жыхарства. Хаты будуць арганізаваны ў Магілеўскай і Полацкай акругах. Арганізуе хаты латыскае бюро НКАсьветы. Да гэтага часу ў БСРР ужо існавалі тры латыскія хаты-чытальні.

Рэдактар-Выдавец: П. Куприян.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.